УДК 811.161.3

# Падоўжаныя зычныя гукі ў беларускай мове

Савіцкая І. У., Гаўрош Н. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Адной з адметных рыс беларускай літаратурнай мовы з’яўляецца падаўжэнне зычных гукаў, інтэрпрэтацыя якога ў школьных падручніках і ў навуковай лінгвістычнай літаратуры неадназначная.

У школьным курсе беларускай мовы, як і ў дапаможніках для ВНУ, традыцыйна вывучаецца фанетычнае падаўжэнне, сутнасць якога заключаецца ў тым, што зычныя [з’], [дз’], [л’], [н’], [с’], [ц’], [ч], [ж], [ш] у становішчы паміж галоснымі вымаўляюцца падоўжана (як адзін гук) і на пісьме перадаюцца праз падвоенае напісанне адпаведных літар: *ззянне, суддзя, гуллівы, варэнне, бязлессе, жыццё, прырэчча, збожжа, пешшу.* Тлумачыцца падаўжэнне законам поўнай прагрэсіўнай асіміляцыі [j].

Аўтары падручнікаў прапаноўваюць адрозніваць ад фанетычнага падаўжэння марфалагічнае падваенне, калі зычныя знаходзяцца на стыку марфем: *асен-ні, пад-даць, з-заду.* Пры гэтым падвоеныя зычныя, якія знаходзяцца на мяжы прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса, даследчыкі звычайна разглядаюць як два аднолькавыя гукі, падкрэсліваючы, што ў такім выпадку фанетычны аналіз не супярэчыць аналізу слова па саставе. Пры такім падыходзе ўзнікае пытанне аб вызначэнні колькасці гукаў у словах з падоўжанымі і падвоенымі гукамі пры фанетычным разборы.

Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна зразумець сутнасць з’явы падаўжэння ў беларускай мове. У Беларускай граматыцы адзначаецца, што падаўжэнне заключаецца ў павелічэнні часу артыкуляцыі асобных фаз адпаведных гукаў: у змычных і змычна-шчылінных затрымліваецца ў часе змычка моўных органаў, у шчылінных больш доўга вытрымліваецца шчыліна паміж органамі мовы. Паколькі ў час артыкуляцыі змяняецца толькі адна яе фаза, то артыкуляцыйна падоўжаныя зычныя ўяўляюць сабой адзінае гукавое ўтварэнне.

Такім чынам, артыкуляцыйна падоўжаныя зычныя – гэта адзіны элемент, які адрозніваецца ад адпаведных звычайных зычных часам гучання. Пры фанетычным разборы ў навучальняых установах іх трэба разглядаць як адзін гук, незалежна ад пазіцыі ў слове: у пачатку, у сярэдзіне ці на стыку марфем. Падоўжаныя зычныя гукі на пісьме перадаюцца падвоеным напісаннем адпаведных літар. Адсюль мэтазгодна, на нашу думку, ужываць у школьнай практыцы толькі тэрмін ***падоўжаныя зычныя гукі***. Тэрміны ***падвоеныя зычныя*** і ***марфалагічнае падваенне***, якія часта сустракаюцца ў падручніках, не маюць пад сабой падстаў.